большей мере следует учитывать ту ситуацию, в которой принимались судьбоносные решения, бытийствовали те или иные общественно-политические процессы. Нельзя историю осовременивать, оценивать только с позиций сегодняшнего дня. В противном случае неизбежно скатывание на позиции абстрактного морализирования. Всегда правомерно поставить вопрос: а могло ли быть в той исторической системе координат иначе?


Список использованной литературы

1. Костиков, В. Ремонт истории / В. Костиков // АиФ. – 2016. – № 47. – С. 4.
2. Блок, А. Интеллигенция и революция / А. Блок [Электронный ресурс].– Режим доступа : – http://e-libra.ru/read/324971-intelligentciya-i-revolyutciya.html – Дата доступа : 17.12.2016
3. Репина, Л.П. Историческая наука на рубеже XX – XXI вв.: социальные теории и историографическая практика / Л.П. Репина. – М.: Кругъ, 2011. – 560 с.


## БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЕ ПРЫГРАНІЧЧА: ДА ПРАБЛЕМЫ АГУЛЬНЫХ РЫС КУЛЬТУРНАГА АРХЕТЫПА


*С.П. Кулік*
*г. Віцебск, ВДМУ*
*В.С. Сайганава*
*г. Мінск, БДУ*



**Цель статьи** – актуализация проблемы общих ценностных структур архетипа белорусско-российского приграничья как специфической социокультурной реальности.



**Ключевые слова:** культурный архетип, белорусская культура, русская культура, бинаризм и тернаризм, архетип восточно-славянской культуры.


Сённяшні час у развіцці сусветнай культуры азначаны ўзрастаннем працэсаў глабалізацыі, калі “граніцы, якія надае геаграфія сацыяльнай і культурнай прасторы, слабеюць, а людзі такое паслабленне ўсё больш усведамляюць” [1, с. 2–3], калі павышаецца ўзровень трансгранічных перамяшчэнняў, расце “транспарэнтнасць граніц” [2, с. 74–77].

Аднак, многімі даследчыкамі заўважана, што тэндэнцыя да агульнага міжнароднага стылю жыцця дапаўняецца магутнай супрацьдзеючай тэндэнцыяй − тэндэнцыяй да адраджэння і падтрымання нацыянальных культур. Фарміраванне глабальнага светаўспрымання, дастойны ўваход у адзіную, цэласную агульначалавечую культуру магчымы толькі на аснове “зберажэння ўласнай культурнай, нацыянальнай, рэлігійнай, моўнай і расавай самасвядомасці… Чым больш падобнымі становяцца нашы стылі жыцця, тым больш упарта мы прытрымліваемся глыбокіх каштоўнасцей, якія адлюстроўваюцца ў рэлігіі, мове, мастацтве і літаратуры. Па меры ўсё большага збліжэння нашых “знешніх светаў” мы ўсё больш цэнім тыя традыцыі, якія бяруць пачатак у нетрах нашага ўласнага свету” [3, с.120]. Дыялектычны тэзіс “адзінства праз мнагалікасць” сёння ўсё больш супрацьпастаўляецца ментальнасці “ашчасліўлення” чалавецтва з боку адной, альбо некалькіх, дзяржаў ці ідэалогій. Цікаўнасць да айчыннай гісторыі, каштоўнасцей і своеасаблівасцей нацыянальнай культуры зусім не супярэчыць, а, наадварот, садзейнічае разуменню агульных для чалавецтва інтарэсаў і мэт. Таму ўсебаковае даследаванне архетыпаў нацыянальных культур садзейнічае пошуку “агульнага”, як сярэдзіннага элемента ў супрацьлегласці “сваё – чужое”, што дэтэрмінуе сучасную і

Репозиторий ВГУ

будучую гісторыю чалавецтва. Найбольш яскрава гэты агульны сярэдзінны элемент праяўляе сябе ў культурных архетыпах пагранічча.

Беларуска-расійскае прыгранічча − вельмі спецыфічная сацыяльна-культурная рэчаіснасть ў гісторыка-палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных адносінах. Гэта абумоўлена прыналежнасцю асноўнай часткі насельніцтва да ўсходне-славянскага этнасу, агульным гістарычным лёсам, доўгім знаходжаннем у адзіных дзяржаўных утварэннях.у мінулым і ўдзелам у міжрэгіянальных і міждзяржаўных інтэграцыйных працэсах сёння. Таму даследаванні культурнага архетыпа беларуска-расійскага прыгранічча набываюць у наш час асобую актуальнасць і значнасць.

Архетыпы (ад грэч. αρχή – пачатак, і τίπος- вобраз) як першасныя вобразы, структуры, ідэі, каштоўнасці культуры, што апрыорна фарміруюць актыўнасць светапогляду і дзеяння, праяўляюцца ў міфалогіі, веравызнанні, творах літаратуры і мастацтва і г.д. Адметнай рысай культурных архетыпаў якраз з'яўляецца апрыорнасць гэтых першасных структур мянтальнасці народаў. Культурны архетып − гэта вобраз, які вынікае не з надзённага вопыту (a posteriori), а з гістарычнага (apriori). Прычым, культурны архетып − гэта не змястоўная існасць, якая нададзена народу Творцай, ці Рокам вызначальна пры ўзнікненні, нараджэнні, а форма самасвядомасці і светаўспрымання, абумоўленая прыродна-кліматычнымі, сацыяльна-палітычнымі, эканамічнымі, духоўнымі і іншымі абставінамі і акалічнасцямі гістарычнага вопыту існавання народаў. Культурны архетып выконвае ролю аперцэпцыі − уздзеяння, накладвае адбітак на ўспрыманне наяўнай рэчаіснасці.

У айчыннай навуковай літаратуры, за рэдкім выключэннем, пакуль няшмат работ, прысвечаных выяўленню, азначэнню і аналізу архетыпаў усходнеславянскай культуры ўвогуле. У той жа час даволі падрабязна прааналізаваны архетыпы заходнееўрапейскай і рускай культур, ад азначэння якіх, у сілу памяжоўнасці сярод іх Беларусі, мы і паспрабуем зыходзіць у пабудове гіпотэзы архетыпаў культуры беларуска-расійскага прыгранічча.

Аналіз глыбінных структур культуры прыводзіць многіх даследчыкаў да азначэння рускай культуры як культуры антыноміка-дыссананснага тыпа, у адрозненне ад заходнееўрапейскай культуры − культуры "тэрнарнага" тыпа [4]. Яны зыходзяць з таго, што ў рускай самасвядомасці антынамічны дыскурс закладзены першапачаткова, прычым у форме разарванага, не ведаючага сінтэзу антынамізму. Так, па сцвярджэнню Ю. Лотмана, для рускай культуры характэрны бінарныя структуры, якія вызначаюць спосаб мышлення і самавыражэння нацыянальнага духу, тады як для заходнееўрапейскага менталітэту ў большай ступені ўласцівы тэрнарныя, траічныя структуры. У тэрнарных структурах самыя глыбінныя культурныя выбухі ніколі не ахопліваюць усяго багацця сацыяльных пластоў, заўсёды застаюцца некаторыя каштоўнасці папярэдняга перыяду, якія перамяшчаюцца з перыферыі культуры ў цэнтр. Ідэалам жа бінарных сістэм аб'яўляецца поўнае разрушэнне і пагібель усяго існуючага як заганнага. Тэрнарная сістэма імкнецца прыстасаваць ідэал да рэчаіснасці, бінарная – ажыццявіць на практыцы нерэалізуемы ідэал [5, с. 257]. У гэтым бачыцца адрозненне рускай і еўрапейскай культур, пры гэтым лічыцца, што "дысананс", які закладзены ў рускую культуру, з'яўляецца неабходнай крыніцай яе жыццяздольнасці. Аўтаматычна ўсю ўсходне-славянскую культуру, у тым ліку і беларускую, адносяць да такога антынамічнага архетыпа.

Пры ўсёй прыцягальнасці і, на першы погляд, тлумачальнай здольнасці вышэйназваных поглядаў, з імі ўсё ж нельга пагадзіцца. Па-першае, наўрад ці можна адносіць заходнееўрапейскую культуру да "чыста" тэрнарнага, а рускую − да адназначна бінарнага культурных архетыпаў. Па-другое, вызначэнне архетыпа беларускай культуры, на наш погляд, з'яўляецца, мякка кажучы, не зусім карэктным.



Рэпазіторый ВДУ

Тэрнарызм і бінарызм − гэта хутчэй за ўсё полюсы, у розным прыбліжэнні да якіх і існуюць культурныя архетыпы наогул. Перавага таго ці іншага з іх часта прыводзіць да непрадказальных сацыяльна-палітычных і культурна-гістарычных наступстваў, якія ў сваю чаргу могуць пагражаць існаванню самой культуры.

Справа ў тым, што полюсная арганізацыя культурных архетыпаў можа прывесці да прабуксоўкі закладзеных у чалавечай культуры “машын часу” і тым самым да парушэння законаў самой думкі. Вядома, што свядомасць, думка якраз і азначваюць любое яўленне як культурнае. Згодна з Мамардашвілі М.К., здзяйсненне думкі ў самых крайніх межах сацыяльнай, публічнай прасторы культуры наогул верагодна, але гэта будзе думка, якая не выконвае законаў думкі. Так, напрыклад, не пераважыўшы, не паспрабаваўшы ў свій час такія еўрапейскія з’явы, як капіталізм, грамадзянскае грамадства і г.д., Расія кінулася ў нейкае пасляеўрапейскае становішча. Прабуксоўка “машын часу” ў культуры прывяла да таго, што думка, якая жыве толькі ў сваёй публічнай прасторы, у другой публічнай прасторы існуе толькі ў літары, у знаку. Адсутнасць публічнай прасторы канчаткова “дыскрэтызуе” думку, зводзіць да мінімума магчымасці яе выкарыстання, здзяйснення і развіцця. Рэальнае здзяйсненне думкі замяняецца толькі імітацыяй жыцця думкі дыскрэтнымі сродкамі, знакамі знакаў. Дыскрэтная думка, якая ўяўлялася раней толькі як абстракцыя, становіцца рэальнасцю, але рэальнасцю, пазбаўленай якога-небудзь сэнсу. Такое здумленне можна параўнаць толькі з дыз’юнктыўным “інтэлектам” сучасных камп’ютэраў, дзе любое змяненне, якое здарылася толькі зараз, ужо абазначана, ужо як бы выканана раней, і мы арыентуемся на знак знака. Магчымасць вяртання да здзяйснення жывой думкі патрабуе наладкі ў культуры “машын часу” [6, с. 75–81]. Каб пераадолець разбуральныя тэндэнцыі, вярнуць жыццяздольнасць культуры, патрэбен адыход ад полюсных, гэта значыць пагранічных, сітуацый. У той жа рускай культуры спроб такога выхаду за полюсныя граніцы антынамічных структур архетыпа існуе дастаткова многа: “Сафіанская” ерась рускіх філосафаў, ідэі месіянства, Богачалавецтва, касмізму, наасферы, канцэпцыя еўразійства і многія іншыя). У сваёй працы, прысвечанай бінарнай арганізацыі культуры Увараў М.С. справядліва адзначае: “Жыццяздольнасць рускай культуры, магчымасць яе пасіянарнага існавання ў плыні гісторыі азначаецца не анталогіяй пагранічных станаў, а магчымасцю выхада за межы падобных стэрэатыпаў свядомасці” [7, с. 9].

Таму, робячы першасную выснову, дакладней будзе сказаць, што *заходнееўрапейская культура існуе бліжэй да тэрнарнага полюса, а руская − бліжэй да бінарнага полюса,* што *ў архетыпе заходнееўрапейскай культуры тэрнарныя структуры дэманструюць большую здольнасць да апрыцэпцыі, чым бінарныя, а ў архетыпе рускай культуры − наадварот*.

Цяпер, што тычыцца архетыпа беларускай культуры і культуры беларуска-расійскага прыгранічча.

У вытоках беларускай культуры ляжыць кумуляцыя каштоўнасцей многіх культур, пастаянны і пладатворны працэс узаемаўплыву культур Захаду і Усходу, Пойначы і Поўдня. З гэтага вынікае асімілятыўная здольнасць культуры, талерантнасць, цярплівасць у менталітэце народа. Асімілятыўныя здольнасці забяспечылі таксама выжыванне і захаванасць гэтай культуры і, спадзяемся, забяспечаць у далейшым яе адраджэнне і росквіт. Такая кумулятыўная і асімілятыўная традыцыя ў культуры Беларусі закладзена ў геапалітычных і гістарычных абставінах існавання насельніцтва беларускіх зямель як поля ўзаемапранікнення самых розных культур, у першую чаргу захонееўрапейскай і рускай. Па гэтай прычыне беларускую культуру ніяк нельга аднесці да культур, набліжаных па свайму архетыпу да антынамічна-дысананснага (бінарнага) полюса.



Репозиторий ВГУ

У той жа час, адваротным бокам асімілятыўна-кумулятыўнай здольнасці беларускай культуры, яе талерантнасці з'яўляецца эклектызм, перапыннасць культурных традыцый, драматызм і супярэчлівасць развіцця, што можа прывесці і прыводзіла ў гісторыі да самаадмаўлення і нізкапаклонства перад чужым. Таму гэтую культуру нельга аднесці і да культуры тэрнарнага, траічнага архетыпа.

*Архетыпам як беларускай культуры, так і культуры беларуска-расійскага прыгранічча можна лічыць форму ўзаемадзеяння бінарнага і траічнага архетыпаў*, што адкрывае магчымасць новых тыпаў развіцця, у якіх традыцыя з'яўляецца фундаментам пераемнасці культуры і адначасова дапаўненнем вопыту памежных культур.

Гісторыя дае мноства прыкладаў такога дапаўнення бінарнага і траічнага архетыпаў у жыццядзейнасці беларускай культуры і культуры беларуска-расійскага прыгранічча: агульныя асаблівасці этнагенезу, доўгае суіснаванне паганства і хрысціянства, разбуральныя войны і сумеснае супрацьстанне знешнім ворагам, узаемадапамога і каштоўнасны прыярытэт мірнага жыцця, і г.д. Вельмі часта ў культуры Беларусі і беларуска-расійскага прыгранічча пераплятаюцца дыктат бінарнай гістарычнай стуктуры з яе крайнімі культурнымі вымярэннямі і траічнасць еўрапейскага культурнага архетыпа. Нават самыя трагічныя палітычныя і сацыяльныя выбуховыя працэссы ў гістарычным лёсе беларускага і расійскага народаў не змаглі разбурыць глыбінныя пласты культуры. Часцей мела месца адначасовае спалучэнне выбуху ў адных культурных сферах і паступовага развіцця ў другіх.

Карэнныя змены ў сучаснай гісторыі Беларусі і Расіі даюць магчымасць актуалізацыі тэрнарных культурных структур і, тым самым, садзейнічаюць адмаўленню ад ідэала разбураць "стары свет да аснавання, а потым" на яго руінах будаваць новы. Адна з магчымасцей выяўлення рэальнай асновы для пераемнага развіцця і прагрэсу беларускай і расійскай культур знаходзіцца ў русле адраджэння і росквіту сваіх лепшых нацыянальных традыцый і агульных каштоўнасцей. Гісторыя і каштоўнасны патэнцыял усходне-славянская культуры наогул утрымліваюць у сябе магчымасць актуалізацыі тэрнарных культурных структур і, тым самым, ствараюць асновы для пераемнасці развіцця, для росту інтэграцыйных працэсаў у рамках рэгіянальных і міждзяржаўных аб'яднанняў, у тым ліку на шляху "інтэграцыі інтэграцый", і для росквіту культуры сваіх краін і народаў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. WatersM. Globalization. — L.–N.Y., 1995. — P.3. Цит. по: Фурс В.Н. Глобализация жизненного мира в свете социальной теории (к постановке проблемы) // Общественные науки и современность. − 2000. − № 6.
2. Катценштейн, П. «Международная организация» и исследования вопросов мировой политики / П. Катценштейн, Р Кохэн, С. Краснер // Мировая политика и международные отношения в 1990-е годы: взгляды американских и французских исследователей. − М., 2001.
3. Naisbitt I., Fburdene P. Meqatrends 2000. The New Directions for the 1990's, − N.Y., 1990.
4. Лотман, Ю.М. Культура и взрыв / Ю.М. Лотман. − М., 1992. − С. 269–270; Шестов, Л. Дерзновения и покорности / Л. Шестов. // Афоризмы нежитейской мудрости. − Л.,1990. − С.95; Трубецкой, Е.Н. Смысл жизни / Е.Н. Трубецкой. − М.,1994. − С. 66.
5. Лотман, Ю.М. Культура и взрыв / Ю.М. Лотман. − М., 1992.
6. Мамардашвили, М.К. Мысль в культуре / М.К. Мамардашвили // Философские науки. − 1989. − № 11.
7. Уваров, М.С. Бинарный архетип / М.С. Уваров. − СПб., 1996.



Рэпазіторый ВДУ